Г. Л. ЛАПЦЕВА

## АБ РОЛІ ЛІТАРАТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫХ РЭМІНІСЦЭНЦЫЙ У ПАЭМЕ А. КУЛЯШОВА «ХАМУЦІУС»

Аўтары большасці даследаванняў пра «Хамуціус», адзначаючы яго класічнае гучанне, падкрэсліваюць пэўную арыентаванасць твора на вяршыні сусветнай літаратуры і, перш за ўсё, шэдэўры Шэкспіра і Гётэ.

Сапраўды, у паэме А. Куляшова няцяжка знайсці шэкспіраўскія матывы: вяршынь самаахвярнасці дасягае ўзаемнае пачуццё Каліноўскага і Марысі, Юрась Старжыцкі прыходзіць памерці на магілу сваёй каханай (прыгадаем Рамэа ў склепе Капулецi). «Свет — наш Мантэкі, час — наш Капулецi»,— усклікае куляшоўская гераіня, зразумеўшы, што ў часы Рамэа і Джульеты яшчэ магчыма было бегчы з Вероны, але зараз няма дзе схавацца, таму што ўвесь свет і нават час — іх Мантэкі і Капулецi. Тут, у падтэксце твора, яскрава акрэслена тая нябачная грань, за якой сумная аповесць пра юных закаханых заканчваецца і пачынае набіраць моц трагедыя другога маштабу з невырашальным гамлетаўскім пытаннем.

У паэме трапна выкарыстоўваецца і сэнсавая антытэза. Жаўранак, прадвеснік раніцы, нібы вораг закаханых, перапыняе кароткую ноч шчасця. Аднак у «Хамуцiусе» песня жаўранка — сімвал надзеі, магутны аптымістычны акорд у халтурным харале ночы. «Ідзі ў манахіні!»— заклікае Афелію Гамлет, імкнучыся зберагчы ў брудзе жыцця гэты амаль бесцялесны ўзор бездакорнай цнатлівасці. У Куляшова сама Марыся, здавалася б, створаная, каб «раджаць на зайздрасць нівам // Калыскі калыхаць, як каласкі»,— выракае сябе на манастырскае існаванне. Гэтым самым мастак паказвае варожасць таго грамадскага ладу не толькі законам чалавечнасці, але і самой прыродзе, яе спрадвечнаму мацярынскаму пачатку.

У аблічы куляшоўскай гераіні адбываецца своеасаблівае зліццё культурна-гістарычных рэмінісцэнцый (Джульета, Афелія, дзева Марыя) з элементамі фальклорнай, часам нават «паганскай» паэтыкі.

Беларускі паэт не пайшоў шляхам спрошчана-аптымістычнага вытлумачэння «праклятых пытанняў» быцця, якія ў межах канкрэтнай грамадска-гістарычнай сітуацыі з'яўляюцца прынцыпова невырашальнымі.

Арыгінальнае зніжана-гратэскнае пераасэнсаванне атрымлівае ў Куляшова і вядомая сцэна з «Фаўста». Прадметам гандлю паміж таямнічым Наведвальнікам, даверaным Мураўёва, і Віктарам Старжыцкім у паэме з'яўляецца не «бессмяротная» душа графа, а прыбытковы маёнтак, які таго вымушаюць прадаць за бесцань у абмен на свабоду. Калі граф прадае разам з маёнткам і свае «радыкальныя» перакананні (па сутнасці, здраджвае ім), ён нібы ўступае ў змову з нячыстай сілай.

Вобразы, якія суадносяцца з трансцэндэнтальным светам, відавочна актывізуюцца ў апошніх раздзелах «Хамуцiуса». Але напалову містычны вэлюм у паэме ніколькі не зацямнае, а хутчэй прасвятляе антынародную *сатанінскую* сутнасць расійскага самадзяржаўя.

Наблізіўшыся да класічных узораў, А. Куляшоў здолеў спалучыць у межах аднаго твора канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае з вечным, агульначалавечым. Пільна ўглядаючыся ў зямное быццё сваіх герояў, ён не забывае пра высокае «неба» — звышзадачу кожнага сапраўднага мастака.

Е. Е. ЛИСОВСКАЯ

## ФУНКЦИИ МЕСТОИМЕННОГО СОЧЕТАНИЯ *и тот* В КОНСТРУКЦИЯХ С ВЫСКАЗЫВАНИЯМИ ТЕМЫ

Конструкции с местоименным удвоением нашли широкое освещение в лингвистической литературе, хотя единая точка зрения на сущность этих